міка Ш. была засн. на ірыгацыйным земляробстве: у абшчынных, храмавых і буйнаўласніцкіх гаспадарках выкарыстоўвалася праца вольных абшчыннікаў, кліентаў, рабоў. Змест паліт. жыцця Ш. складала ўнутр. барацьба ў гарадах паміж абшчынай, родава-храмавай арыстакратыяй і вярх. правіцелем. Паміж гарадамі-дзяржавамі вялася барацьба за с.-г. ўгоддзі і ірыгацыйныя сістэмы, што прыводзіла да часовых узвышэнняў аднаго з іх. На пачатку раннедынастычнага перыяду ў 28—25 ст. да н.э. паліт. перавага ад I дынастыі Кіша перайшла да I дынастыі Урука, а потым да I дынастыі Ура. З сярэдзіны 25 ст. да н.э. ўсталявана гегемонія правіцеляў Лагаша (страчана ў 1-й пал. 24 ст. да н.э. пасля няўдалай спробы сац. рэформ Уруінімгіны). Раннедынастычны перыяд скончыўся ў 2-й пал. 24 ст. да н.э. завяваннем Ш. дзяржавай *Акад*. Акад быў разгромлены гуціямі, якія ў канцы 22 ст. да н.э. выгнаны царом Урука Утухенгалем. Улада над Ш. перайшла да цароў III дынастыі Ура. У канцы 21 ст. да н.э. ў выніку нашэсця *амарытаў* і эламітаў Ш. канчаткова страціў самастойнасць. Пазней існаваў як частка *Вавілоніі*. Пра культуру Ш. гл. ў арт. *Вавілона-асірыйская культура*.




*Літ.*: Тюменев А.И. Государственное хозяйство древнего Шумера. М.; Л., 1956; Дьяконов И.М. Общественный и государственный строй древнего Двуречья: Шумер. М., 1959; Вулли Л. Ур халдеев: Пер. с англ. М., 1961; Белицкий М. Забытый мир шумеров: Пер. с пол. М., 1980; Крамер С. История начинается в Шумере: Пер. с англ. 2 изд. М., 1991; Ягө ж. Шумеры: Первая цивилизация на земле: Пер. с англ. М., 2002. *Я.У.Новікаў.*

**ШУМЕ́РЫ**, старажытны народ, які насяляў Паўд. Месапатамію ў 4—2-м тыс. да н.э. (гл. *Шумер*). Мелі самастойную мову, роднаснасць якой з мовамі інш. груп не ўстаноўлена. У антрапал. адносінах належалі да міжземнаморскай і балкана-каўказскай рас. вял. еўрапеоіднай расы. З сярэдзіны 3-га тыс. да н.э. пачаўся паступовы працэс выцяснення шумерскай мовы і асіміляцыі Ш. акадцамі, якія завяршыўся ў 1-й пал. 2-га тыс. да н.э. Ш. — стваральнікі *клінапісу*; шумерская культура паслужыла асновай для развіцця культур пазнейшых цывілізацый Месапатаміі. *Я.У.Новікаў.*

**ШУ́МІК** Сяргей Васілевіч (5.7.1928, г. Харкаў; Украіна — 1.3.1994), бел. вучоны ў галіне эксплуатацыі аўтамаб. транспарту. Д-р тэхн. н. (1981), праф. (1982). Скончыў Усесаюзны завочны політэхн. ін-т (Масква, 1954). З 1970 нач. кафедры Усурыйскага вышэйшага ваен. аўтамаб. вучылішча. З 1975 у БПА (у 1975—90 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах эксплуатацыі і метадах дыягностыкі тэхн. стану аўтамабіляў. Аўтар навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

*Тв.*: Диагностирование и устранение неисправностей легковых автомобилей. Мн., 1987 (разам з Я.Л.Савічам, М.В.Вепрэнцавым); Техническая эксплуатация автотранспортных средств: Курсовое и дипломное проектирование. Мн., 1988 (разам з М.М.Болбасам, Я.І.Петуховым); Техническая эксплуатация автомобилей. Мн., 1996 (разам з Я.Л.Савічам). *У.У.Яцкевіч.*

**ШУМІ́ЛАВА** Эмілія Іванаўна (н. 7.1.1929, г. Яраслаўль, Расія), расійскі і бел. мастацтвазнавец, крытык, педагог. Канд. мастацтвазнаўства (1967). Скончыла Маскоўскае харэаграфічнае вучылішча (1947), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1954). З 1947 салістка Новасібірскага т-ра оперы і балета, адначасова з 1957 дырэктар і маст. кіраўнік створанага ёю Новасібірскага харэаграфічнага вучылішча. У 1963—64 у Новасібірскім абл. упраўленні культуры, з 1967 у Мін-ве культуры Расіі, Мін-ве культуры СССР. З 1975 у Мінскім ін-це культуры (з 1983 заг. кафедры), з 1993 у Рас. акадэміі слав. культуры ў Маскве (з 2000 праф.). Даследуе праблемы балетнага т-ра, нацыянальнага ў маст. культуры, харэаграфічнай фалькларыстыкі, муз.-харэаграфічнага выхавання дзяцей і моладзі. Аўтар манаграфій «Праўда балета» і «Нацыянальная своеасаблівасць балета» (абедзве 1976), буклетаў, прысвечаных спектаклям бел. балетнага т-ра, сцэнарыяў дакумент. фільмаў на студыі «Беларусьфільм» «Турбуюся і люблю» (1981), «Творчы партрэт Юрыя Траяна» (1982), «Танцуе Саркісьян» (1983), праграм Бел. тэлебачання «Бальны танец учора і сёння» (1983), «Магія натхнення» (1986) і інш. *М.А.Козенка.*

**ШУМІ́ЛІНА**, гарадскі пасёлак, цэнтр Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. Чыг. станцыя на лініі Віцебск—Полацк; аўтадарогі на Віцебск, Полацк, Бешанковічы, Гарадок. За 40 км ад г. Віцебск. 7,9 тыс. ж. (2002). Прадпрыемствы харч., тарфяной, мясц. прам-сці. 2 сярэднія і юнацка-спарт. школы, Палац культуры, 3 б-кі, бальніца, аптэка, паліклініка, 2 аддз. сувязі. *Шумілінскі гісторыка-краязнаўчы музей*. Брацкая магіла бел. партызан і ахвяр фашызму. Вайсковыя могілкі.

У 19 ст. вёска ў Ловажскай вол. Полацкага пав. Віцебскай губ. У 1866 у Ш. 38 ж., 5 гаспадарак, 13 пабудоў. Пасля будаўніцтва Рыга-Арлоўскай чыг. (1886) пабудаваны чыг. станцыя (да 1962 наз. Сіроціна), царква; вёска вырасла ў мястэчка. З 1924 цэнтр *Шумілінскага раёна* (да 1961 Сіроцінскага р-на) Віцебскай акр. (1924—30), з 1938 — Віцебскай вобл.; з 1938 гар. пасёлак. У Вял. Айч. вайну з 8.7.1941 да 23.6.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія знішчылі ў Ш. і раёне 1,5 тыс. чал. У 1962—66 Ш. ў складзе Віцебскага р-на.

*Літ.*: Память: Ист.-док. хроника Шумилинского р-на. Мн., 1985.

**ШУМІ́ЛІНА** Ірына Міхайлаўна (н. 3.12.1956, Мінск), бел. піяністка. Засл. арт. Беларусі (1992). Скончыла Бел. кансерваторыю (1980, кл. Р.*Шаршэўскага*). З 1982 салістка Бел. філармоніі. Яе выкананне вылучаецца віртуознасцю, удумлівасцю ў інтэрпрэтацыі муз. першакрыніцы. У рэпертуары пераважаюць творы класікі і сучасных кампазітараў. Першая выканаўца шматлікіх твораў бел. кампазітараў, у т.л. санаты і цыкла фп. п'ес Л.Абеліёвіча (прысвечаны ёй). Лаўрэат Рэсп. і Міжрэсп. (Талін, абодва 1976) конкурсаў музыкантаў-выканаўцаў. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1984. *В.П.Пракапцова.*

**ШУМІ́ЛІНСКІ ГІСТО́РЫКА-КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й**. Засн. 28.5.1984, адкрыты 22.11.1986 у г.п. *Шуміліна* як музей нар. славы, з 1993 сучасная назва. Пл. экспазіцыі 163 м$^2$, 3 залы, больш за 8,5 тыс. экспанатаў асн. фонду (2003). Сярод экспанатаў матэрыялы археал. раскопак на тэр. раёна, пра падзеі грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі 1918—20, станаўленне сав. улады, абарончыя баі, дзейнасць патрыят. падполля і партыз. руху ў Вял. Айч. вайну, зброя партызан, асабістыя рэчы і дакументы землякоў Герояў Сав. Саюза П.А.*Акуцыёнка*, М.А.*Ласкунова*, Дз.М.*Мінчугова*, М.К.*Спірыдзенкі*, фотаздымкі 106 Герояў Сав. Саюза, якія вызначыліся пры вызваленні Шумілінскага р-на ад фаш. акупантаў. У экспазіцыі прылады працы і побыту, адзенне і абутак сялян і гараджан 19 — пач. 20 ст., вырабы дэкар.-прыкладнога мастацтва, калекцыя жывапісу мясц. майстроў, у т.л. мастака У.П.Белавусава. *С.В.Іванова.*

**ШУМІ́ЛІНСКІ РАЁН**. Размешчаны ў цэнтр. частцы Віцебскай вобл. Утвораны 17.7.1924 як Сіроцінскі р-н, перайменаваны ў Ш.р. 23.11.1961 (скаса-

РЕПОЗІТОРЫЙ БГУ